ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В.Клімовіч
“23” студзеня 2026 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы
ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу
“Кераміка Крэва”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы (далей – конкурс) ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу “Кераміка Крэва”.

2. Конкурс праводзіцца штогод з мэтай адраджэння, захавання і развіцця ганчарства, аднаго са старажытнейшых мастацкіх рамёстваў Беларусі, падтрымкі і развіцця ганчарнага майстэрства ў розных рэгіёнах Беларусі, удасканальвання прафесійнага майстэрства майстроў керамістаў і папулярызацыі іх творчасці, паказу дасягненняў у галіне сучаснай керамікі, садзейнічання развіццю сувенірнага рынку, прафесійных сувязей, стварэння ўмоў для творчых зносін, абмену вопытам работы, выкарыстання ганчарнага майстэрства для рэалізацыі сацыяльных праектаў, выхавання культуры керамікі падчас правядзення ганчарнага кірмашу і жывых зносін пакупнікоў і майстроў, далучэння ўсіх жадаючых да працэсу атрымання ганчарных вырабаў шляхам яго дэманстрацыі і непасрэднага ўдзелу ў правядзенні майстар–класаў, эстэтычнага выхавання насельніцтва.

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”), аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” (далей – ДУК “Смаргонскі РЦК”).

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт) (дадатак 1).

5. У конкурсе прымаюць удзел вядучыя майстры па ганчарстве і мастацкай кераміцы з усіх раёнаў Гродзенскай вобласці і другіх рэгіёнаў Беларусі (па запрашэнні аргкамітэта).

6. Конкурс адбудзецца **8 жніўня 2026 г.** ў аг. Крэва Смаргонскага раёна.

7. Конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях:
лепшы выраб з гліны на вольную тэматыку (хатняе заданне);
лепшы выраб з гліны на месцы.

8. Для ўдзелу ў конкурсе майстроў па ганчарстве і кераміцы майстры прадстаўляюць мастацкі (ганчарны) выраб з гліны на вольную тэматыку, створаны напярэдадні конкурсу, а таксама неабходныя матэрыялы для выканання конкурснай работы на месцы ў традыцыях ганчарскай справы і мастацкай керамікі (ганчарны круг, гліна ў разліку на выраб 1-2 работы).

9. Прадстаўленыя на конкурс хатнія работы неабходна суправаджаць этыкеткамі з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, матэрыялу і тэхнікі выканання работ, поўнай назвы ўстановы, якую прадстаўляе канкурсант (-ы).

10. Пераможцаў конкурсу вызначае журы (Дадатак 2) і ўзнагароджвае дыпломамі I, II, III ступені ў рамках і прызамі.

11. Журы пакідае за сабой права ў рамках агульнага прызавога фонду аб'ядноўваць, падзяляць прызавыя месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

12. Журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў конкурсу спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках у наступных намінацыях:

за глыбіню вобразнага раскрыцця тэмы;

за арыгінальнасць кампазіцыйнага рашэння;

за пераемнасць народных традыцый;

за крэатыўнае мастацкае мысленне;

за інтэрпрэтацыю народных традыцый у творчасці.

13. Астатнія ўдзельнікі атрымліваюць дыпломы "за ўдзел".

14. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўлічваюцца: захаванне і ўвасабленне нацыянальных традыцый; арыгінальнае кампазіцыйнае рашэнне; выкарыстанне новых тэхналогій.

15. Рашэнне членаў журы па выніках конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення конкурсу на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

16. Работы лаўрэатаў конкурсу не вяртаюцца аўтарам, застаюцца ў выставачным фондзе ДУК "Смаргонскі РЦК".

17. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 20 ліпеня 2026 года на электронны адрас ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" (info@gromc.by) даслаць заяўку (Дадатак 3).

18. Каардынатарам, які ажыццяўляе арганізацыйную працу па размяшчэнні ўдзельнікаў конкурсу на пляцоўцы, з'яўляецца філіял "Раённы Дом рамёстваў" ДУК "Смаргонскі РЦК" (кантактны тэлефон: +375447679363).

19. Фінансаванне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" на цэнтралізаваныя культурныя мерапрыемствы.

20. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, рамак для дыпломаў, выраб дыпломаў.

21. Для фінансавання конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

22. Усе эпізоды конкурсу могуць фіксавацца на розных электронных носьбітах. Арганізатары пакідаюць за сабой права выкарыстоўваць дадзены матэрыял у рэкламных мэтах без узгаднення з удзельнікамі. За дадзеныя здымкі ганарары ўдзельнікам не выплачваюцца.

23. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення конкурсу (у іншыя тэрміны).

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
### конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу “Кераміка Крэва”

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Ражэва Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, сустаршыня аргкамітэта; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Зяновіч Т.В. | загадчык філіяла “Раённы Дом рамёстваў” ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Крацянок Г.І. | дырэктар ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”. |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы

СКЛАД ЖУРЫ
конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу “Кераміка Крэва”

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня журы; |
| Ражэва Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, сустаршыня журы; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні журы; |
| Пятрук А.П. | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Зяновіч Т.В. | загадчык філіяла “Раённы Дом рамёстваў” ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”; |
| Крацянок Г.І. | дырэктар ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”. |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу майстроў па ганчарстве і кераміцы

ЗАЯЎКА
на ўдзел у конкурсе майстроў па ганчарстве і кераміцы ў рамках абласнога фестывалю-кірмашу "Кераміка Крэва"

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку______________________________
______________________________________________________________
2. Дата нараджэння____________________________________________
______________________________________________________________
3. Месца пражывання, кантактны тэлефон________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
4. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)
______________________________________________________________
______________________________________________________________
5. Работы, прадстаўленыя на конкурс:

| № п/п | Намінацыя | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|---|
| 1. | | | |

Кіраўнік базавай установы

_____________________ _____________
*(ініцыялы, прозвішча)* *(подпіс)*

*Удзельнікам неабходна паведаміць загадзя аргкамітэт аб неабходнасці падключэння электрычнага ганчарнага круга.*